ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК
БЕЛАРУСІ

САВЕТ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ ІНСТЫТУТА ГІСТОРЫІ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ
запрашае да ўдзелу ў

# І канферэнцыі маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі «ARS LONGA: НАВУКОВЫЯ ДАСЯГНЕННІ, ПРАЕКТЫ, ПЕРСПЕКТЫВЫ»

**1–2 сакавіка 2018 г., Мінск**

Больш за трэцюю частку супрацоўнікаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі складае моладзь. Маладыя навукоўцы прымаюць актыўны ўдзел ва ўсіх напрамках даследаванняў, што праводзіць наша ўстанова, штогод выступаюць на шматлікіх канферэнцыях і выпускаюць дзясяткі публікацый у Беларусі і за яе межамі. Разам з тым існуе патрэба ў стварэнні зручнай пляцоўкі для сталай навуковай камунікацыі паміж маладымі навукоўцамі ў самім Інстытуце. У сувязі з гэтым Савет маладых вучоных абвяшчае **І канферэнцыю маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі**, якая адбудзецца *1–2 сакавіка 2018 г*.

Мы запрашаем маладых навукоўцаў, лабарантаў і аспірантаў прэзентаваць аднаасобныя ці калектыўныя праекты і даследаванні апошніх гадоў. Мы верым, што правядзенне такой сустрэчы паспрыяе развіццю ўнутрыінстытуцкіх прафесійных кантактаў і актывізуе творчыя пошукі.

Заяўкі на ўдзел у працы канферэнцыі, запоўненыя па ўзору, прымаюцца ў электронным выглядзе да ***10 лютага 2018 года*** на адрас Савета маладых вучоных Інстытута гісторыі НАН Беларусі: sawetmuig@gmail.com

**Кантакты:**

Святлана Велент-Шчэрбач +375 29 338-70-41

Алена Грос +375 29 869-59-80